WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 ЛІСТАПАДА 2010 г. ЧАЦВЕР № 221 (26829)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА I КВАРТАЛ і I ПАЎГОДДЗЕ 2011 г.
*Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)*

| Індэкс | месяц | I квартал | паўгоддзе |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 12400 | 37200 | 74400 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 11600 | 34800 | 69600 |
| 63858 (ведамасны) | 19900 | 59700 | 119400 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 18000 | 54000 | 108000 |

Заставайцеся з намі!

## У БЕЛАРУСІ ЎДАСКАНАЛЕНЫ ПАРАДАК РЭГУЛЯВАННЯ АРЭНДНЫХ АДНОСІН

**Адпаведны ўказ № 569 Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 5 лістапада.**

Рэалізацыя ўказа дасць магчымасць выканаць даручэнне кіраўніка дзяржавы, дадзенае пры звароце з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, у частцы недапушчэння росту памеру арэнднай платы. Дакумент удакладняе асобныя нормы ўказа № 518 ад 23 лістапада 2009 года ў мэтах адназначнага іх прымянення, ён таксама дасць магчымасць знізіць сацыяльную напружанасць у прадпрымальніцкіх структурах.

У прыватнасці, указам прадугледжваецца ўдакладненне парадку вызначэння сродкаў, што падлягаюць выплаце ў бюджэт арэндадаўцамі гандлёвых месцаў на рынках і гандлёвых аб'ектах у гандлёвых цэнтрах.

Прадугледжана магчымасць здачы ў арэнду нерухомай маёмасці, што знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці, без правядзення аўкцыёну арандатару, які належным чынам выконваў свае абавязкі па раней заключаным дагаворы арэнды.

Таксама з'явілася магчымасць уліку некампенсаваных сум па дагаворах пазыкі, заключаных да ўступлення ў сілу ўказа ад 23 кастрычніка 2009 года № 518 і не засведчаных натарыяльна, пры ўстанаўленні павышаючых каэфіцыентаў да ставак арэнднай платы, калі такія дагаворы ўлічваліся аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам пры ўзгадненні павышаючых каэфіцыентаў да арэнднай платы, што ажыццяўляецца ў адпаведнасці з указам ад 24 сакавіка 2005 года № 148.

Новым указам выключана прымяненне павышаючага каэфіцыента 3 да плошчаў, арандуемых для размяшчэння кіраўніка, іншых органаў кіравання юрыдычнай асобы або адасобленых падраздзяленняў.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ МІКАЛАЯ МЯРКУШКІНА З УСТУПЛЕННЕМ НА ПАСАДУ КІРАЎНІКА МАРДОВІІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Мікалая Мяркушкіна з уступленнем на пасаду кіраўніка Рэспублікі Мардовія Расійскай Федэрацыі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ФАРТУШОК ДЛЯ «ДЗЕВАЧКІ»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




**Перад тым, як адправіцца ў лясны куток з каменным аброчным крыжам, Ганна Елісееўна Ашомка паведаміла, што нельга шкодзіць каменю і, крый Божа, яго распранаць. «Бо аднойчы знайшліся цікавыя, захацелі паглядзець, што пад ручнікамі, альбо праверыць, ці здарыцца што, — прыгадала нейкую далёкую гісторыю жыхарка вёскі Баравое. — Дык як пацямнела неба, загрымела, біла маланка гэтак, што ледзь іх не пазабівала!»**

У акрузе Мілашэвіч Лельчыцкага раёна некаторыя культавыя крыжы ўяўляюць жаночыя вобразы. Гэтае ўрочышча за вёскай Баравое называюць па-рознаму. Адны кажуць «камень», іншыя «баба» альбо «дзевачка».

— Раней крыж сапраўды быў падобны на жанчыну, у яго нават грудзі былі, як у жанчыны, але цяпер ён схаваўся ў зямлю, — кажа Ганна Елісееўна. Яна з маленства памятае гэтае язычніцкае месца — побач хадзілі ў ягады, навокал пагорка было поле. Цяпер шуміць малады хвойнік, і без памагатых, як Ганна Ашомка, знайсці «дзевачку» няпроста. Можна доўга блукаць побач і не заўважыць яе. Лепей за ўсё прыходзіць сюды не з пустымі рукамі: з галінкай вярбы, пукам валошак або жменяй чарніц. Калі ж давядзецца абракацца, трэба павязаць ручнік ці фартушок. Ганна Елісееўна наклала на «дзевачку» зялёную атласную тканіну ў выглядзе фартуха і штосьці неўпрыкмет прашаптала. Мы ціха пакінулі ўрочышча і вярнуліся ў вёску.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**

Украінскі рэжысёр Сяргей ЛОЗНІЦА:

## «Гісторыю пра хлопчыка і бацьку мне расказаў Васіль Быкаў»



Сяргей Лозніца — рэжысёр, які нарадзіўся ў Беларусі, сёлета стаў аўтарам адной з самых спрэчных стужак постсавецкай прасторы, якая была паказана на Канскім кінафестывалі. Фільм «Шчасце маё» (дэбютны для рэжысёра, які дагэтуль быў вядомы як дакументаліст) паказалі ў рамках асноўнага конкурсу «Лістапада», ён выклікаў шквал эмоцый — ад рэзкага непрымання да разумення таго, што так адбываецца ў жыцці: людзі губляюцца, сярод чужых яны часцей за ўсё не разлічваюць на дапамогу... Прадставілі карціну сам аўтар і акцёр Віктар Немец, абодва жартавалі, што прыйшлі ў свет у адной баранавіцкай радзільні.

Напэўна, ёсць усё-такі адчуванне месца і еднасці з тымі, хто жыве тут дагэтуль. Бо Сяргей Лозніца прызнаўся, што яго першы фільм мог быць зусім іншы:

— Спачатку я хацеў здымаць карціну паводле Васіля Быкава. Але для дэбюту знайсці грошы на карціну па такой тэме даволі складана. Усе кажуць: Другая сусветная вайна, усё сказана, нецікава... Але ніхто не разумее, што хоць усё сказана, але ніхто нічога не чуе. І тады ў 2004 годзе я напісаў гэты сцэнар, і мы знайшлі фінансаванне на гэтую карціну. Але шукалі доўга. Гэта не дзяржаўныя, а прыватныя грошы. Бо хто дасць невядомаму дакументалісту грошы на дэбютны фільм? У нас, на жаль, існуе дакладны падзел з савецкіх часоў на дакументальнае і ігравое кіно. Дакументальнае кіно не лічылі мастацтвам, а залічвалі да прапаганды. Але ж мы забываем, што і адно, і другое можа быць немастацкім. Бюджэт фільма «Шчасце маё» склаў 1 мільён 460 тысяч еўра. 60 працэнтаў ад гэтай сумы далі немцы.

***— Чаму ў сучасную гісторыю ўведзены эпізоды, звязаныя з вайной?***

— У карціне дзве гісторыі з Вялікай Айчыннай вайны. Адна была расказана мне Васілём Быкавым — пра хлопчыка і бацьку. Другую распавёў чалавек, якога мы фатаграфавалі ў 1999 годзе, калі я спытаў пра самую запамінальную падзею ў жыцці. Ён пабачыў фотаапарат і заплакаў... Усе эпізоды звязвае дарожная гісторыя. Усё гэта мы таксама можам чуць сёння з навінаў: згубіўся грузавік, прапаў чалавек... Але я лічу, што вытокі сучаснай жорсткасці трэба шукаць раней, у мінулым. Бо зло спараджае іншае зло. Але, магчыма, капаць трэба яшчэ глыбей, пачынаючы з рэвалюцыі. Адбылося злачынства. Чаму тады справядлівасць не адноўлена? Сур'ёзнае пытанне...

***— Вы збіраецеся працягваць гэтую тэму ў наступных фільмах?***

— Наступную карціну я хачу зняць паводле аповесці Васіля Быкава «У тумане». Гэта будзе таксама не камедыя. З аднаго боку, звычайная, з другога боку, парадаксальная ў сваёй нявырашанасці гісторыя. Чалавека падазраюць у тым, што ён супрацоўнічаў з акупантамі, і два партызаны едуць забіваць мірнага жыхара. Заканчваецца ўсё дрэнна для ўсіх...

***— Не баіцеся, што вас зноў не зразумеюць у жаданні капаць да самых цёмных бакоў чалавечай душы?***

— Усё залежыць ад таго, наколькі чалавек думае ці не думае пра тое, што адбывалася. Наколькі ён мысліць.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

**Вниманию акционеров ОАО «Белгорхимпром»!**

**Внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Белгорхимпром» состоится 24 ноября 2010 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, актовый зал (3 этаж).**

**Повестка дня:**
1. О внесении дополнений в устав ОАО «Белгорхимпром».

Регистрация акционеров — в день проведения собрания с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале (3 этаж). УНП 600024712

# РЫХТУЮЦЦА ПРАПАНОВЫ АБ ПАВЫШЭННІ МІНІМАЛЬНАЙ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ СА СТУДЗЕНЯ 2011 ГОДА

**Пра гэта паведаміў на пасяджэнні Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Пётр ГРУШНІК.**

— Міністэрства рыхтуе прапановы аб павышэнні мінімальнай заработнай платы (далей — МЗП) са студзеня 2011 года да ўзроўню мінімальнага спажывецкага бюджэту (далей — МСБ), — сказаў Пётр Грушнік. — Памер МЗП са студзеня гэтага года не мяняўся да лістапада. Указам жа кіраўніка дзяржавы на лістапад—снежань 2010 года вызначана месячная МЗП у памеры Br400 тыс. У адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта, дадзеным на шостым з'ездзе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, з 1 студзеня 2011 года памер МЗП павінен быць вызначаны не ніжэй за ўзровень МСБ (зараз гэты нарматыў складае Br 459,6 тыс. — **Н.Д.**).

Пётр Грушнік падкрэсліў, што ў параўнанні з 2005 годам памер МЗП павысіўся ў 3,1 раза.

Што тычыцца сярэдняй зарплаты па рэспубліцы, то, як нагадаў **намеснік міністра эканомікі Андрэй ТУР**, яна ў снежні 2010 года павінна скласці $500 у эквіваленце. Сярэдняя ж зарплата ў верасні дасягнула $430,4 і павялічылася ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 27,5%. Вераснёўскі заробак у бюджэтнай сферы склаў у сярэднім $331, што на 31,8% вышэй, чым у верасні 2009 года.

Падчас свайго выступлення першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны распавёў і пра тыя меры, якія прымаюцца па скарачэнні адміністрацыйнага рэгулявання аплаты працы ў камерцыйных арганізацыях галінаў эканомікі. У прыватнасці, паводле яго слоў, з 2009 года былі перагледжаны практычна ўсе асноўныя нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць аплату працы. Работа праводзілася па чатырох прыярытэтных напрамках. Па-першае, гэта дыферэнцыяцыя і рэгуляванне тарыфнай часткі заработнай платы работнікаў камерцыйных арганізацый. Па-другое, расшырэнне правоў наймальнікаў ва ўстанаўленні ўзроўню аплаты працы работнікаў у залежнасці ад эфектыўнасці гаспадарання і прымянення гібкіх сістэм аплаты працы. Па-трэцяе, удасканаленне ўмоў аплаты працы кіраўнікоў арганізацый. Чацвёрты напрамак — узмацненне сацыяльнай абароны работнікаў.

— Работа па лібералізацыі падыходаў у аплаце працы будзе працягвацца і ў далейшым, — заверыў Пётр Грушнік. — Гэта дазволіць сфарміраваць рынкавыя стымулы для павышэння інавацыйнай актыўнасці ўсіх суб'ектаў гаспадарання, стварыць спрыяльны клімат для прыцягнення інвестыцый у рэспубліку, спрыяць павышэнню міжнароднага рэйтынгу беларускай дзяржавы. А ў выніку гэта прывядзе да павышэння дабрабыту народа і павышэння яго працоўнай актыўнасці.

### «ІНВЕСТЫЦЫІ Ў МАДЭРНІЗАЦЫЮ ЭКАНОМІКІ Ў БЛІЖЭЙШЫЯ ПЯЦЬ ГАДОЎ ПЛАНУЕЦЦА ПАВЯЛІЧЫЦЬ У 4 РАЗЫ»

Нямала ўвагі было нададзена на пасяджэнні Нацыянальнага савета і інвестыцыям. У прыватнасці, паводле слоў першага намесніка прэм'ер-міністра Уладзіміра СЯМАШКІ, Беларусь у 2011-2015 гадах плануе інвеставаць у эканоміку 105 трлн рублёў. Гэта ў 4 разы больш у параўнанні з мінулай пяцігодкай. А па прадпрыемствах Міністэрства прамысловасці аб'ём інвестыцый у бліжэйшыя пяць гадоў наогул, чакаецца, вырасце ў 10 разоў.

Уладзімір Сямашка адзначыў, што за пяцігодку ў Беларусі плануецца пабудаваць шэраг новых прадпрыемстваў сучаснага ўзроўню, а таксама развіваць ужо існуючыя валаўтваральныя вытворчасці.

— Трэба будаваць вялікі завод па вытворчасці чыгуннага ліцця, — адзначыў першы віцэ-прэм'ер. — Гэта неабходна беларускаму машынабудаванню. Таксама ўліку буйных і важных праектаў павінна стаць будаўніцтва завода па вытворчасці вадкакрышталічных панеляў. Гэта, зразумела, патрабуе вялізных грошай. Абнаўленне асноўных фондаў будзе ажыццяўляцца па ўсіх галінах эканомікі. У прыватнасці, пяцігадовыя інвестыцыйныя праграмы будуць рэалізоўвацца на МАЗе, БелАЗе, МТЗ...

Наступная пяцігодка, на думку першага намесніка прэм'ер-міністра, будзе складанай для рэальнага сектара эканомікі.

— Пастаўленыя перад прамысловасцю задачы па нарошчванні вытворчасці патрабуюць накаплення абаротнага капіталу і значнага росту рэнтабельнасці вытворчасці. Без рашэння гэтых задач прадпрыемствам будзе складана займацца мадэрнізацыяй.

Акрамя таго, Уладзімір Сямашка адзначыў, што высокая закрэдытаванасць прамысловасці не спрыяе яе эфектыўнай працы.

**Да ведама, праект Генеральнага пагаднення паміж урадам Беларусі, рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзамі на 2011—2012 гады, які абмяркоўваўся на пасяджэнні Нацыянальнага савета, плануецца падпісаць у снежні гэтага года. Галоўная ж мэта генеральнага пагаднення, паводле слоў намесніка міністра эканомікі, — павышэнне ўзроўню і якасці жыцця людзей, а гэта значыць, павышэнне грашовых даходаў у цэлым, заработнай платы, пенсійнага забеспячэння і сацыяльнай абароны.**

### ХТО МОЖА ПРЭТЭНДАВАЦЬ НА АКЦЫІ «НАФТАНА»?

Уладзімір Сямашка не выключае, што ў Беларусі можа быць прынята рашэнне аб продажы акцый (магчыма, і кантрольнага пакета) ААТ «Нафтан» Венесуэле. Пры гэтым ён нагадаў, што ў статутным фондзе ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод» 41,6% складае доля расійскага боку, а ў статутным фондзе ААТ «Нафтан» увесь пакет акцый належыць Беларусі.

— Венесуэльскія кампаніі дакладна так, як і іншыя краіны, могуць прэтэндаваць і стаць акцыянерамі нафтаперапрацоўчых заводаў Беларусі, — адзначыў першы віцэ-прэм'ер. — Усё залежыць ад таго, якія ўмовы прапануе інвестар.

Паводле слоў Уладзіміра Сямашкі, патэнцыйны інвестар павінен валодаць трыма неабходнымі якасцямі: сродкамі, сыравінай і ўласнымі рынкамі збыту. Больш за тое, ён павінен мець не толькі ўнутраныя рэсурсы, каб набыць пакет акцый, але і прапанаваць інвестыцыйную праграму, разлічаную як мінімум на 10 гадоў.

— Як Расія (Уладзімір Сямашка адзначыў, што расійская кампанія «Лукойл» таксама не страчвае цікавасці да актываў «Нафтана»), так і Венесуэла адпавядаюць усім гэтым патрабаванням. Таму абедзве гэтыя краіны могуць прэтэндаваць на тое, каб стаць стратэгічным інвестарам. Мы асцярожна падыходзім да акцыянавання і прыватызацыі стратэгічных прадпрыемстваў, шукаем надзейнага партнёра.

Але пакуль, як пераканаў Уладзімір Сямашка, ніякіх перамоў па продажы пакета акцый «Нафтана» ні з Венесуэлай, ні з якім іншым інвестарам не вядзецца.

**Надзея ДРЫЛА.**

## Марская птушка заляцела ў Беларусь з-пад Мурманска

### Пад Мінскам зафіксаваны новы для краіны від птушак — паўночная олуша

**Сенсацыйную навіну з загадкавай гісторыяй паведамілі рэдакцыі ў грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Мёртвая птушка з маскоўскім кальцом была знойдзена мясцовымі жыхарамі непадалёк ад горада Смалявічы. Птушка ляжала на тратуары каля аўтамабільнай дарогі побач з невялікай сажалкай. Візуальнае абследаванне птушкі сведчыла аб тым, што яе не падстрэлілі, а хутчэй за ўсё, яна была збітая машынай. Мясцовыя жыхары чамусьці вызначылі птушку як звычайнага бугая ці маладога баклана. Птушка яшчэ ляжала на ранейшым месцы тры дні, але потым знікла. Потым інфармацыю пра кальцо ў Беларускі цэнтр кальцавання птушак перадаў член АПБ Віталь Сахвон, якому праз знаёмых трапіла гэтае кальцо.**



Марская олуша можа стварыць сур'ёзную канкурэнцыю айчынным бакланам?

Дарослая палярная олуша.

А ўжо праз тры тыдні з Маскоўскага цэнтра кальцавання прыйшоў адказ, што гэта паўночная олуша, якую акальцавалі птушанём 31 ліпеня 2010 года ў Мурманскай вобласці, на тэрыторыі Кандалакшскага запаведніка на востраве Харлаў.

**Спецыяліст па экалагічнай адукацыі АПБ Руслан ШАЙКІН** паведаміў, што паўночная олуша з'яўляецца марской птушкай, якая па памерах большая за нашага вялікага баклана. Адна з асаблівасцяў гэтага віду — характэрны метад палявання на рыбу. Птушка з вялікай вышыні нырае на глыбіню ў некалькі метраў і хапае тлустую рыбу, якая недасягальная для іншых птушак, што кормяцца на паверхні вады.

А вось **дырэктар Беларускага цэнтра кальцавання птушак Павел ПІНЧУК** лічыць, што гэтае вяртанне кальца даволі незвычайнае, бо птушку знайшлі далёка ад марскога ўзбярэжжа, дзе яна гняздуецца і мігрыруе. Часткова гэта можна патлумачыць тым, што знойдзена маладая птушка, для якіх характэрны разлёт нават да 5 тысяч кіламетраў ад месца нараджэння.



Маладая птушка.

Спецыялісты АПБ разлічваюць, што яшчэ сёлета паўночная олуша можа папоўніць афіцыйны спіс птушак Беларусі. Знаходка будзе разгледжана Беларускай арнітафаўністычнай камісіяй, куды інфармацыю праз сайт Birdwahch. by даслаў Віталь Сахвон. Раней, па знаходцы замежнага кальца, у Беларусі адзначалася палярная крычка і стэлерава гага.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Амаль 75 працэнтаў беларусаў лічаць дзейнасць Прэзідэнта Беларусі карыснай для краіны

Такія звесткі рэспубліканскага сацапытання, праведзенага ў кастрычніку 2010 года аналітычным цэнтрам EcooM, паведамілі карэспандэнту **БЕЛТА** ў цэнтры. На думку 18,9 працэнта рэспандэнтаў, дзейнасць кіраўніка дзяржавы не прыносіць вынікаў: 14,2 працэнта лічаць яе «хутчэй бескарыснай», 4,7 працэнта — «цалкам бескарыснай». Не адказалі на пытанне сацыёлагаў 6,5 працэнта апытаных.

## Сацапытанне: самыя галоўныя заслугі Аляксандра Лукашэнкі — стабільнасць, парадак і захаванне суверэнітэту краіны

Стабільнасць і парадак, захаванне суверэнітэту Беларусі з'яўляюцца самымі галоўнымі заслугамі Аляксандра Лукашэнкі на пасадзе Прэзідэнта. Такое меркаванне ўдзельнікаў рэспубліканскага сацыялагічнага даследавання, праведзенага ў кастрычніку 2010 года аналітычным цэнтрам EcooM, паведамілі карэспандэнту **БЕЛТА** ў цэнтры. На шматварыянтнае пытанне аб тым, што самае важнае Аляксандр Лукашэнка зрабіў для краіны на пасадзе Прэзідэнта, 26,1 працэнта рэспандэнтаў адзначылі стварэнне стабільнасці і навядзенне парадку, 13 працэнтаў — адсутнасць абвальнай прыватызацыі, 10,5 працэнта — захаванне суверэнітэту. У заслугу дзеючаму кіраўніку дзяржавы рэспандэнты таксама ставяць развіццё вёскі (7,2 працэнта), спорту і турызму (7,2 працэнта), чысціню ў гарадах (5 працэнтаў), захаванне эканомікі і прамысловасці (4,2 працэнта), своечасовую выплату зарплат і пенсій (3,4 працэнта). Калі б выбары адбыліся заўтра, то за Аляксандра Лукашэнку аддалі б свой голас 64,1 працэнта рэспандэнтаў. Было апытана 1498 грамадзян ва ўзросце 18 гадоў і старэйшыя.

ISSN 1990 - 763X

Ва Урадзе

## САЦЫЯЛЬНЫ ПРЫЯРЫТЭТ БУДАЎНІЦТВА

**Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмай на 2010 год прадугледжана будаўніцтва і рэканструкцыя 511 сацыяльна значных аб'ектаў. Паводле слоў міністра архітэктуры і будаўніцтва Аляксандра Селязнёва, сёлета з іх плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 239 аб'ектаў і пускавых комплексаў. Як было адзначана на ўчарашнім пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, якое прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага, гэтая праграма мае сацыяльную накіраванасць.**

Як удакладніў міністр, прыярытэтнымі з'яўляюцца, у прыватнасці, аб'екты ў сферы аховы здароўя (11), адукацыі (19), культуры (14). Напрыклад, з 11 аб'ектаў Міністэрства аховы здароўя, якія будуюцца, забяспечаны ўвод у эксплуатацыю корпуса Віцебскага медыцынскага ўніверсітэта і медкарпусоў рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця». За час, які застаўся да канца года, плануецца таксама ўвесці ў эксплуатацыю аб'ект рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гематалогіі і трансфузіялогіі. Выдаткаваныя грошы на будаўніцтва і рэканструкцыю згаданых і іншых аб'ектаў на гэты год будуць асвоеныя, заказчыкі заявілі пра рэальнасць вызначанага задання па ўводзе. Разам з тым, як заўважыў Аляксандр Селязнёў, аналіз выканання графікаў будаўніцтва выклікае сумненні па трох аб'ектах. Адсутнасць належнага кантролю з боку заказчыкаў за выкананнем графікаў будаўніцтва падраднымі арганізацыямі прывёў да таго, што на іх за студзень—верасень заданне выканана менш як на 50 працэнтаў. Як мяркуюць у міністэрстве, сітуацыя, што склалася, можа прывесці да невыканання да ўстаноўленага тэрміну ўводу ў эксплуатацыю і асваення сродкаў не ў поўным аб'ёме па 10 пераходзячых аб'ектах. У прыватнасці, менш за 10 працэнтаў асвоена па дзяржпраграме інфарматызацыі Беларусі «Электронная Беларусь». У гэтай сувязі міністр прапанаваў прыняць рашэнне па пераразмеркаванні сродкаў: 35 мільярдаў рублёў, якія не асвойваюцца па пераходзячых аб'ектах, можна накіраваць на іншыя, больш значныя праекты, што фінансуюцца сёлета.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ІНФЛЯЦЫЯ Ў РАСІІ З ПАЧАТКУ ГОДА ДАСЯГНУЛА 7 АДСОТКАЎ

Цэны ў Расіі з пачатку гэтага года выраслі на сем адсоткаў, паведамляецца ў матэрыялах Расстата. Годам раней за той жа перыяд інфляцыя склала 8,2 адсотка. За тыдзень з 2 па 8 лістапада 2010 года індэкс спажывецкіх цэн павялічыўся на 0,2 адсотка. Мацней за ўсё падаражэлі проса, алей і грэчка.

### ВЕРСІЙ ЗАГАДКАВАГА РАКЕТНАГА ПУСКУ Ў КАЛІФОРНІІ СТАНОВІЦЦА ЎСЁ БОЛЬШ

**Загадкавы «запуск ракеты» каля берагоў Каліфорніі ўвечары 8 лістапада актыўна абмяркоўваецца экспертамі, журналістамі і блогерамі. Вайскоўцы дагэтуль не выступілі з афіцыйнымі тлумачэннямі — пакуль яны абмяжоўваюцца толькі асобнымі нефармальнымі выказваннямі. Гэта не толькі падаграває цікавасць да тэмы, але і выклікае занепакоенасць.**



Чарговую версію выдаў віцэ-прэзідэнт Калегіі ваенных экспертаў Расіі генерал-маёр Аляксандр Уладзіміраў. На яго думку, гэта маглі быць выпрабаванні, праведзеныя прыватнай ваеннай кампаніяй, ці несанкцыянаваны пуск міжкантынентальнай балістычнай ракеты Trident 2 з борта субмарыны тыпу Ohio. Да такой высновы ён прыйшоў, вывучыўшы распаўсюджаны відэазапіс тэлеканала KCBS і на аснове неафіцыйных каментараў Пентагона. «Калі гэта так, то ўзнікае шмат пытанняў, найперш звязаных са станам амерыканскіх Узброеных сіл», — заявіў эксперт. Прадстаўнік Пентагона раней паведаміў, што ніхто ў міністэрстве пакуль не можа растлумачыць кадры, паказаныя тэлеканалам. У сваю чаргу Аб'яднанае камандаванне сіл ППА Паўночнай Амерыкі і Паўночнае камандаванне УС ЗША выпусцілі такое сумеснае паведамленне: «Можам пацвердзіць, што няма пагрозы для нацыі. Мяркуючы па ўсім, гэта не быў замежны ракетны пуск. Дадзім больш інфармацыі па меры яе паступлення».

Газета The Los Angeles Times прама піша, што адсутнасць адказаў з боку федэральных чыноўнікаў здаецца вельмі дзіўнай на фоне іх запэўніванняў пра адсутнасць пагрозы.

### БУНДЭСВЕР У АФГАНІСТАНЕ ЎЗМАЦНІЛІ... АСЛОМ

**Вайскоўцы бундэсвера, дыслакаваныя на поўначы Афганістана ў павеце Чахар-дара, які лічыцца апорай «Талібана», набылі асла, які будзе задзейнічаны ў аперацыях супраць баевікоў, паведамляе Welt.**



Як адзначыў у гэтай сувязі капітан Міхаэль Л., камандуючы трэцяй роты аператыўнага злучэння ў Кундузе, выкарыстанне асла з'яўляецца «тактычнай неабходнасцю». «Часам даводзіцца звяртацца да нетрадыцыйных рашэнняў», — заявіў ён. Асёл па мянушцы Херман павінен будзе пераносіць на спіне цяжкае ўзбраенне і боепрыпасы падчас патрулявання па цяжкапраходных рысавых палях. Жывёла была набыта на мясцовым рынку за 100 долараў. Раней у сувязі з актывізацыяй талібаў у зоне адказнасці бундэсвера на поўначы Афганістана Мінабароны ФРГ заявіла пра ўзмацненне ўзбраення нямецкіх вайскоўцаў.

### МАГНАТ ПРЫДУМАЎ ГАТЭЛІ, ДЗЕ ПЛАТУ БУДУЦЬ БРАЦЬ ПАРНАГРАФІЯЙ

Швецкі порнамагнат Берт Мільтан-малодшы прапанаваў стварыць па ўсім свеце сетку з сотні пяцізоркавых гатэляў, пастаяльцы якіх змогуць спыняцца там бясплатна. З умовай, што будуць займацца сэксам, дазволіўшы здымаць іх забаўкі на ўсталяваныя ў нумарах камеры. Яны таксама павінны будуць падпісаць дамову, якая дазваляе публікацыю відэаматэрыялаў у інтэрнэце. Такую прапанову Мільтан-малодшы выказаў на старонках амерыканскай газеты The New York Post. Магнат падлічыў, што кожны такі гатэль будзе прыносіць у сярэднім 43,8 мільёна долараў штогод.

## НАЎЦІЛУС І АФОНЯ БУДУЦЬ ВЫЗНАЧАЦЬ ПЕРАМОЖЦУ ДЗІЦЯЧАГА ЕЎРАБАЧАННЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Нядаўна Мінскі цэнтр акіянаграфіі папоўніўся двума ўнікальнымі відамі — галаваногім малюскам Наўцілусам і маленькім (пакуль) васьміногам, якія за сваю цікаўнасць паспеў атрымаць мянушку Афоня.



— Прарадзіма новых прадстаўнікоў марской фаўны і Інданезія і Каліфарнійская акваторыя, — паведаміў дырэктар пазашкольнай культурна-асветнай установы «Адкрыты акіян» Аляксей Азараў (на фота), — яны крыху адаптуюцца да нашых умоў і будуць «судзіць» удзельнікаў конкурсу дзіцячага Еўрабачання.

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.11.2010 г. (для б/н разлікаў)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 3 030,00 | 1 чэшская крона | 170,21 |
| ▼ 1 еўра | 4 185,04 | 1 польскі злоты | 1072,55 |
| 1 латвійскі лат | 5 894,37 | ▲ 1 расійскі рубель | 98,72 |
| 1 літоўскі літ | 1 210,79 | 1 украінская грыўня | 380,99 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 30,6925 |
| 10 UAH | 38,5681 |
| 1000 BYR | 10,1362 |
| EUR | 42,3004 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

# Мяккі стыль

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Ці вось калі рыхтаваўся Указ аб дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамозе, узнікла пытанне па цукровым дыябеце. Такім хворым трэба пастаянна купляць шпрыцы, дарагія тэст-палоскі — гэта іх жыццё, на ім не зэканоміш. Колькі тады людзей прыходзіла да мяне на прыём і скардзілася, як ім цяжка!.. Я мякка, але настойліва пераконвала Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Проста таму, што сама цвёрда ўпэўненая: і дзецям, якія маюць патрэбу ў рэабілітацыі, і інвалідам 3 групы павінна аказвацца дзяржаўная дапамога на набыццё медыцынскіх сродкаў. Відаць, мой зварот быў сярод многіх іншых, і яны разам прывялі да таго, што так і было зроблена. У мяне ўвогуле складваецца ўражанне: дэпутацкія прапановы заўжды на вельмі руплівым маніторынгу. Мы ж ад людзей ідзём. І тое разумнае, слушнае, што ініцыіруем, выходзіць у выглядзе заканадаўчых рашэнняў.

***— Добрая зарука, відаць, і папярэдні вопыт — доктарскі. Зрэшты, чаму папярэдні? Чула, што на дэпутацкай пасадзе Ларыса Багдановіч працягвае сачыць за здароўем брастаўчан...***

— Ёсць такое. Кажу па справе, не люблю гаварыць агульнымі фразамі ды вытрымкамі з законаў, — пра сацыяльныя гарантыі, а заадно і пра тое, як берагчы здароўе. Расказваю пра здаровае харчаванне, правільны рэжым дня, як засцерагчыся ад сардэчна-сасудзістых захворванняў, сачыць за вагой. Хачу, каб мае выбаршчыкі разумелі: ніхто, апроч іх саміх, здароўе ім не забяспечыць. І ведаеце, на такіх сходах у людзей заўжды непадробная цікаўнасць. Збіраюцца вялікія аўдыторыі — і па 100, і па 150 чалавек, шмат пытанняў задаюць. Сустрэчы заўжды маюць адпаведны рэзананс — значыць, усё гэта не бескарысна.

***— Увогуле часта брастаўчане звяртаюцца да вас па медыцынскай частцы?***

— Так часта, што мне нават цяжка сказаць, ці насамрэч столькі медыцынскіх пытанняў узнікае ў выбаршчыкаў, ці яны проста ідуць з імі да мяне як да ўрача. Нярэдка мая адукацыя элементарна дапамагае хутчэй унікнуць у праблему. Вось, скажам, у мяне на прыёме мама з хворым дзіцем. Я адразу бачу дыягназ. Захворванне, пры якім дзеці паміраюць... Я не задаю маме лішніх пытанняў, гэта дазваляе мне быць больш тактоўнай і разумець нават тое, што ў яе не паварочваецца язык вымавіць. Як маці, якая выхоўвае дзіця-інваліда, яна павінна атрымаць субсідыю на будаўніцтва жылля. А што будзе, калі дзіця загіне?.. Законам канкрэтна прапісваецца, што выдадзеных грошай у маці ўжо ніхто не забярэ.

***— Жыллёвыя пытанні таксама адны з самых «хадавых»?***

— З будаўніцтвам жылля ў Брэсце зараз ёсць адна недарэчнасць. Так атрымалася, што пастанова Саўміна, якая дазваляе выдаваць субсідыю першачаргавікам (а туды патрапілі і сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў), выйшла пазней за рашэнне гарвыканкама. І ўтварылася дадатковая група атрымальнікаў, грошы на якіх не прадугледжаныя. Бацькі адразу да мяне звярнуліся — сем'яў 40 — я, вядома ж, пачала працаваць з Мінфінам, гарвыканкамам, гарсаветам. Усе разам гэтае пытанне сталі вырашаць — спрабаваць знайсці неабходныя грошы. У той жа час я не прыхільніца таго, каб утрыманства квітнела. Каб усе былі забяспечаныя нейкімі льготамі і дапамогамі без разбору. Калі мы не будзем прывучаць чалавека працаваць на самога сябе, мы ніколі не прыйдзем да таго грамадства, якое будзе працаваць. Разумею, што гэта непапулярная думка. Аднак я пра гэта кажу на ўсіх сустрэчах, таму што так лічу. Хачу, каб мы рухаліся наперад, развіваліся.

***— Работа ў профільнай камісіі разам з працяглым вопытам па рэабілітацыі людзей з абмежаванымі магчымасцямі, напэўна, не дае страціць сувязі з гэтай сацыяльнай групоўкай?***

— Так, безумоўна. Некаму трэба дапамагчы арганізаваць лячэнне, камусьці нават пракансультаваць. Каб пазбягаць на дэпутацкім прыёме прыёму медыцынскага, перыядычна праводжу кансультацыі на базе рэабілітацыйнага цэнтра «Тонус» *(дзе Л. Багдановіч працавала галоўным урачом. —* **«МС»***)* — там і ўмовы ёсць, каб глядзець дзяцей. Калі б ні прыехала ў Брэст, заўжды на старую работу заходжу, бяру ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах, якія там праводзяцца. Хоць тэрытарыяльна гэта і не мая акруга. Я проста не магу інакш: для мяне гэта больш, чым работа. І як на ранейшай пасадзе я была звязаная з гэтай групай насельніцтва, так і сёння з імі кантактую. У курсе ўсіх іх праблем і, наколькі магчыма, стараюся ўсё вырашыць своечасова. У нейкай ступені гэта дазваляе кантраляваць канкрэтную групу насельніцтва.

***— Што атрымалася зрабіць для цэнтра на дэпутацкай пасадзе?***

— У нас раней быў толькі дзённы стацыянар, іншагароднім бацькам даводзілася цяжка — жыць недзе на кватэрах, траціць грошы. Цяпер, дзякуючы падтрымцы нашага губернатара, ёсць рашэнне аб будаўніцтве спальнага корпуса на тэрыторыі цэнтра. Для людзей гэта вялікая палёгка. І міністру аховы здароўя Васілю Жарко мы таксама вельмі ўдзячныя: ён даў дазвол на закупку абсталявання з рэспубліканскага бюджэту. Справа слушная і карысная.

***— А што для вас сёння — найбольшы галаўны боль, калі мець на ўвазе акругу?***

— Паколькі самыя істотныя праблемы вырашаныя, можна сказаць, што галаўны боль зняты, і я... шукаю новы! Аналізую ўсе свае запісы з прыёмаў, сустрэч, візітаў — каб выкрышталізаваць тэндэнцыі. Увогуле я спакойная, што людзі не ідуць зараз вялікімі групамі. Гэта значыць, глабальных праблем няма і мясцовая ўлада працуе не ўхаластую. Брэст вельмі актыўна будуецца, ён надзвычай дынамічны, сучасны, я б нават сказала, заходні. І пра ўсе грандыёзныя планы жыхароў актыўна інфармуюць, таму асаблівых прэтэнзій, што нечага неад'емнага нестае, людзі не маюць. А гэта ўжо нагода для пазітыўнага настрою.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

# А ЎСЁ АСТАТНЯЕ — ДАДАСЦА...

Добры дзень, паважаная рэдакцыя!

Прачытала ў вашай газеце ліст «Самакіраванне на паперы?» (7 кастрычніка г.г.) і хачу таксама выказацца з гэтай нагоды. *(Нагадаем: аўтар ліста напісаў пра тое, што стараста ў вёсцы — «пасада» фіктыўная, бо насамрэч яны нічога не робяць. —* **Рэд.***)* Упэўненая, што такі ліст мог даслаць толькі вельмі пакрыўджаны чалавек. А маё меркаванне такое: каб стараста сапраўды быў старастам і абараняў інтарэсы аднавяскоўцаў, яго трэба выбіраць з карэнных жыхароў гэтага населенага пункта. А яшчэ хацелася б, каб стараста добра валодаў роднай мовай і ведаў Дзяржаўны гімн. І, безумоўна, ашчадна і паважліва ставіўся да людзей. А ўсё астатняе дадасца, напрацуецца з часам.

Крыху пра сябе. Мне 61 год, жыву ў вёсцы Пільшычы Бялыніцкага раёна і з'яўляюся старастай гэтага населенага пункта.

**З павагай, БУЧМАНАВА Ганна Піліпаўна.**



Фота Мары ЖЫЛІНСКАЙ.

Старшыня Слабада-Кучынскага сельскага Савета дэпутатаў Нэлі ГУСЕВА.

# ТЭМА «НУМАР АДЗІН»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Да мінулага года ў вёсцы Слабада-Кучынка — цэнтральнай сядзібе сельсавета — не было свайго Дома культуры. Дакладней, некалі ён існаваў, належаў сельгаспрадпрыемству, але паступова прыйшоў у заняпад. На сесіях сельскага Савета дэпутаты неаднойчы ўздымалі пытанне пра аднаўленне клуба. Не ведаючы, адкуль узяць сродкі на рамонт, Гусева спрабавала «выцягнуць» будынак уласнымі намаганнямі — пры дапамозе суботнікаў. Агітаваць жыхароў да ўдзелу ў іх не прыйшлося — мясцовая моладзь даўно чакала адкрыцця «культурнай кропкі». Так што працавалі на суботніку — зрывалі гнілую падлогу, мылі сцены і столь, прыбіралі смецце — заўзята. Некаторыя нават прапаноўвалі «скінуцца» ўсёй вёскай, каб сабраць патрэбную суму на рамонт. Але Гусева, як прафесійны эканаміст, падлічыла ўсе неабходныя расходы і прыйшла да высновы, што сваімі сіламі будынак не пацягнуць... У чарговы раз звярнулася да старшыні Капыльскага райвыканкама і раптам пачула: «Рыхтуйце праектна-каштарысную дакументацыю, будзем разглядаць».

— Сродкі на аплату дакументацыі, каля 500 тысяч рублёў, мы зарабілі дзякуючы здадзенаму металалому — да яго збору падключылася насельніцтва. Пасля гэтага райвыканкам уключыў наш «аб'ект» у план па рэканструкцыі. А ў мінулым годзе Дом культуры быў уведзены ў эксплуатацыю. Цяпер моладзі ёсць дзе сустракацца, бавіць час, адпачываць... Мой сын, які вучыцца ў Мінску, на выхадныя літаральна ляціць сюды, бо на дыскатэцы дапамагае дыджэю, — усміхаецца Нэлі Эдуардаўна.

З цягам часу на тэрыторыі сельсавета застаецца ўсё менш пустых будынкаў. Некаторыя дачакаўшыся рэканструкцыі, змяняюць сваё аблічча і разам з новым вонкавым выглядам набываюць другое жыццё. Сёння, напрыклад, завяршаецца рэканструкцыя спартзалы ў самай вялікай (па колькасці вучняў) школе самага буйнога населенага пункта сельсавета — вёскі Старыца. Некалі спартзала будавалася сіламі сельгаспрадпрыемства — зразумела, без усякай тэхнічнай дакументацыі. Не вытрымаўшы выпрабаванняў часам, пачала разбурацца — у выніку стан яе быў прызнаны аварыйным. І вось з дапамогай абласнога і раённага бюджэтаў удалося «ўдыхнуць» другое жыццё ў такі неабходны для вёскі аб'ект.

Тое, што не паддаецца рэканструкцыі, падпадае пад знос. Маюцца на ўвазе ў першую чаргу пустыя будынкі жылых дамоў, непатрэбныя спадчыннікам. З моманту выхаду Указа Прэзідэнта № 70 на тэрыторыі Слабада-Кучынскага сельсавета знесена больш за 30 такіх будынкаў. А магло б быць і больш, тлумачыць старшыня Капыльскага раённага Савета дэпутатаў Марыя Сандрозд, бо артыкул «на знос» у абласным бюджэце ёсць.

— Але сёлета нашаму раёну выдзелілі на адпаведныя мэты толькі 10 мільёнаў рублёў — на ўсе 13 сельсаветаў! Нават па мільёну на кожны не атрымліваецца, — гаворыць Марыя Леанідаўна.

У выніку сельсаветам даводзіцца шукаць іншыя спосабы пазбаўлення ад пустых будынкаў. Дзесьці іх разбірае само насельніцтва, дзесьці — сельгаспрадпрыемствы... Але, лічыць старшыня раённага Савета дэпутатаў, гэта не лепшае вырашэнне праблемы. Таму што сам будынак агульнымі намаганнямі так-сяк зносіцца, а вось рэкультывацыю ўчастка зрабіць няма як, бо няма за што. Там застаюцца дрэвы, фундамент... Гэткія «астраўкі» сярод вёскі , якія цяжка ўцягнуць у абарот.

— Адразу пасля выхаду Указа № 70 на яго рэалізацыю з рэспубліканскага бюджэту выдзяляліся нармальныя сродкі, якіх хапала і на знос будынкаў, і на сур'ёзную рэкультывацыю ўчасткаў. Але потым фінансісты палічылі гэта вялікай тратай бюджэтных грошай і абмежавалі нашы магчымасці. У выніку праца па зносе атрымліваецца няякаснай, — гаворыць Марыя Сандрозд, якая адказвае за добраўпарадкаванне ўсіх трынаццаці сельсаветаў і таму шчыра перажывае за кожны з іх. — Нам кажуць: няхай, маўляў, вам дапамогуць вашы сельгаспрадпрыемствы. Але ж гаспадаркі сёння таксама лічаць грошы. Акрамя таго, яны і так нам дапамагаюць: і смецце вывозяць, і магілкі абслугоўваюць, і міні-палігоны... На знос старых дамоў — калі рабіць гэта ТАК, ЯК ТРЭБА, — неабходныя дадатковыя грашовыя ўліванні з рэспубліканскага бюджэту.

«Так, як трэба», паказала сёлета гаспадарка «Старыца-агра», — знесла два пустыя будынкі ў вёсцы Андросаўшчына, а на месцы старых дамоў будуе сучасныя катэджы. Населеныя пункты ад гэтага, зразумела, выйграюць. Але сельгаспрадпрыемства не можа зносіць за свае сродкі ўсе «развалюхі» на тэрыторыі сельсавета, не мае магчымасці займацца «дабрачыннай» рэкультывацыяй былых участкаў. Так што пытанне са зносам — менавіта якасным! — старых будынкаў застаецца для Слабада-Кучынскага і іншых сельсаветаў раёна адкрытым.

А ўвогуле пераважная большасць праблем у сельсавеце вырашаецца ў працоўным парадку. Кожны наступны дзень прыносіць старшыні Савета новыя клопаты, якія часам не ўпісваюцца ні ў якія «службовыя рамкі» і выходзяць далёка за межы абавязкаў кіраўніка мясцовай улады. Вось не так даўно памёр мужчына — яго хворая жонка, якая нідзе да гэтага не працавала, засталася без сродкаў і дакументаў. Давялося тэрмінова афармляць ёй групу інваліднасці. Нэлі Эдуардаўна сама з'ездзіла да жанчыны ў бальніцу, сфатаграфавала яе на пашпарт. А потым падняла на ногі мясцовыя грамадскія арганізацыі, каб аказаць ёй грашовую падтрымку, пакуль афармляліся дакументы.

Прыёмныя дні ў старшыні Слабада-Кучынскага сельскага Савета дэпутатаў — заўсёды і... паўсюдна. Яе датычыцца ўсё, любая дробязь. Яна ведае ў твар, а тое і па імёнах усіх жыхароў кожнай з 26 вёсак. Куды б Гусева ні прыехала, да яе адразу пачынаюць «сцякацца» людзі са сваімі пытаннямі: адзін просіць прывезці брыкет, другі — паўплываць на сына, які злоўжывае спіртным, трэці — паўшчуваць суседа, каб не адвязваў сабаку...

— Гэта не толькі іх жыццё, але і маё таксама, — гаворыць Нэлі Гусева. — Цяпер з людзьмі прыемна размаўляць, яны сталі больш давяраць мясцовай уладзе. Калі ім спакойна і даходліва ўсё патлумачыць, пастаўяцца да сітуацыі з разуменнем, а да цябе — з павагай. Але ж праз пэўны час абавязкова пацікавяцца, як вырашаецца ўзнятае пытанне... Так што паабяцаць і забыцца не атрымаецца — злоўжываць даверам нельга.

**Наталля КАРПЕНКА,**
*Капыльскі раён.*

# Вуліца акцёраў Яроменкаў і помнік Марку Фрадкіну

**У Віцебску мясцовыя ўлады вырашылі ўшанаваць памяць славутых землякоў. Адну з новых вуліц на тэрыторыі сучасных жылых комплексных новабудоўляў прапанавалі назваць у гонар акцёраў Яроменкаў. Задумалі таксама паставіць помнік славутаму земляку — вядомаму кампазітару, народнаму артысту СССР, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі Марку Фрадкіну. Гэтымі знакамітымі людзьмі горад па праву ганарыцца.**

Вядома, што Мікалай Яроменка-старэйшы — народны артыст СССР, у свой час служыў у віцебскім тэатры Якуба Коласа акцёрам (з 1948 да 1959 года). А Яроменка-малодшы, які ў 1994 годзе быў удастоены звання народнага артыста Расіі, нарадзіўся ў Віцебску (у 1949-м).

Знакаміты кампазітар Марк Фрадкін нарадзіўся ў Віцебску 4 мая 1914 года ў сям'і ўрачоў (памёр у Маскве, у 1990 г.). Ён — аўтар мноства папулярных песень. Такіх, як «Бранская вуліца», «Цячэ Волга», «Выпадковы вальс» і іншыя. Многія песні вядомыя нам з савецкіх кінафільмаў. Адразу ўспамінаюцца «Камсамольцы-дабравольцы», «А гады ляцяць» і іншыя.

Як сведчаць біёграфы, пасля вучобы ў ленінградскім інстытуце Марк Фрадкін працаваў у мінскім Тэатры юнага гледача і паралельна вучыўся ў кансерваторыі. Кампазітар праз усё жыццё пранёс любоў да роднага Віцебска. Як і Яроменка-малодшы, і яго бацька, які заўсёды з асаблівай цеплынёй гаварыў пра Віцебск.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ДЫРЭКТАР НЕ ВЫПЛАЦІЎ КАМАНДЗІРОВАЧНЫЯ

**У Полацку работнікі падатковай інспекцыі падчас праверкі прыватнага ўнітарнага прадпрыемства горада ўстанавілі, што дырэктар атрымліваў у банку грошы на выплату камандзіровачных выдаткаў сваім падначаленым, але камандзіровачныя яны так і не атрымалі.**

Мэту расходавання атрыманых грошай дырэктар правяраючым абгрунтаваць не здолеў. У выніку ўстанавілі, што наяўныя камандзіровачныя грошы сталі незаконным даходам бізнэсмена. Па выніках праверкі, у бюджэт дадаткова налічылі больш за 35 мільёнаў рублёў, у тым ліку 29 мільёнаў рублёў падаходнага падатку і 6 мільёнаў пені.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# САМАЕ ДАРАГОЕ — МЕТАЛІЧНЫ ЛОМ І БУЛЬБА

**9 лістапада супрацоўнікі міліцыі ў Магілёўскай вобласці затрымалі некалькі аўтамабіляў з незаконнымі грузамі.**

Прэс-цэнтр Магілёўскага УУС паведаміў, што ў горадзе Горкі аўтамабіль, якім кіраваў 21-гадовы мясцовы жыхар, які нідзе не працуе, перавозіў 3 тоны лому чорнага металу без дакументаў. У Краснапольскім раёне паблізу вёскі Ясенка супрацоўнікі міліцыі спынілі аўтамабіль, якім кіраваў 41-гадовы жыхар Чэрыкава: у кузаве было 8 тон лому чорных металаў.

А ў горадзе Чэрыкаве аўтамабіль 47-гадовага расіяніна затрымалі з прычыны зусім іншага грузу: жыхар Пензенскай вобласці перавозіў 8 тон бульбы без адпаведных дакументаў. Па ўсіх фактах цяпер вядзецца праверка.

**Алена КАЗЛОВА.**


**Г. ВИТЕБСК** **14.12.2010**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Здание бани с холодной пристройкой, расположенное по адресу: Витебская область, Полоцкий район, д. Малое Ситно | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 250/С-31162 (здание бани с холодной пристройкой), одноэтажное кирпичное, фундамент – бетонный, а/ц листы по деревянным стропилам, общей площадью 84 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 223883803101000020, площадью 0,0325 га для содержания и обслуживания недвижимого имущества, сроком аренды 50 лет. Назначение – для размещения объектов: административно-хозяйственного назначения, розничной торговли, общественного питания, гостиничного назначения, физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения, культурно-просветительского и зрелищного назначения, бытового обслуживания населения. | **35000** | **35000** |
| 2. | Здание клуба с холодной пристройкой, расположенное по адресу: Витебская область, г. Верхнедвинск, ул. Московского, 39 | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 251/С-63918 (здание клуба с холодной пристройкой), одноэтажное, бревна облицованные кирпичом, фундамент – бетонный, кровля – шиферная, общей площадью 114 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 221050100001002059, площадью 0,0428 га, сроком аренды 30 лет. Назначение – для обслуживания здания клуба с перспективным назначением для обслуживания производственного здания, допустимого для размещения в смешанной застройке по согласованию с органами государственного санитарного надзора. Ограничения в использовании земельного участка в связи с расположением в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы (река Дрисса) на площади 0,0428 га и в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000В на площади 0,0044 га. | **35000** | **35000** |
| 3. | Здание клуба, расположенное по адресу: Витебская область, Оршанский район, Клюковский с/с, д. Софиевка, д. 29 | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инв. № 240/С-30337 (сооружение специализированное культурно-просветительного и зрелищного назначения), бревенчатое одноэтажное, 1969 г.п., общ. площадь 94,4 кв.м, объем 371 куб.м, фундамент бетонный, перекрытие деревянное, крыша шиферная. Земельный участок: с кадастровым номером 223682706101000025 для содержания и обслуживания клуба, площадь 0,0222 га. Использование – для специализированного культурно-просветительного и зрелищного назначения. | **35000** | **35000** |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.**

ПРОДАВЕЦ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ: Белорусский производственно-торговый концерн лесной, деревообрабатывающей и целлюлозно-бумажной промышленности, контактный телефон в г. Минске (017) 227 52 54.

**Условия продажи недвижимого имущества:**

**по лотам №№ 1, 2, 3** – осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данных объектах, создание им дополнительных рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объектов до выполнения им условий договора купли-продажи.

**Условия предоставления земельных участков:**

**по лоту № 1** – получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения исполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет (в случае изменения назначения недвижимого имущества); осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией (в случае изменения назначения недвижимого имущества);

**по лоту № 2** – заключение победителем аукциона договора аренды земельного участка с исполкомом и осуществление государственной регистрации права на земельный участок в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; ведение хозяйственной деятельности на земельном участке в соответствии с требованиями статьи 77 Водного кодекса Республики Беларусь, в связи с расположением земельного участка в водоохранной зоне вне прибрежной полосы реки Ушача;

**по лоту № 3** – заключение победителем аукциона с Клюковским сельисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства (реконструкции) объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

**Аукцион состоится 14 декабря 2010 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

1. Для участия в аукционе приглашаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: негосударственным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 13.12.2010 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 14.12.2010 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11.03.2010 № 342. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

**5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; **не позднее 10 рабочих дней** со дня принятия решения исполкома о предоставлении ему земельного участка возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка, в сумме 2 миллиона рублей (по каждому лоту); **не позднее 12 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.


# Аўтамабіль для вяскоўца — ужо не раскоша

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

— На карову трэба 3 тоны, — падлічвае Ігар Мяцеліца. — Аддаў 180 тысяч рублёў і забыўся пра клопат. І гэтыя грошы хутка вернуцца: у летні перыяд карова дае дзясятак літраў малака на дзень. У сярэднім за месяц можна зарабіць 200-250 тысяч рублёў на здачы малака. Так што выдаткі кампенсуюцца менш чым за месяц. Большасць гаспадароў карыстаюцца такой паслугай, як дастаўка сена.

Асноўным пытаннем, расказаў Ігар Мяцеліца, была і застаецца якасць малака. Пад'ём базіснай тлустасці да 3,6 працэнта нарадзіў шмат скаргаў і разбораў.

— У нас кожныя 10 дзён лабарант едзе разам са зборшчыкам малака, бярэ аналіз, піша на пробе толькі нумар, каб было незалежнае стаўленне, і толькі потым едзе на малочны блок, — тлумачыць сістэму старшыня сельскага Савета. — Які тлушч выявілі, за такі і плацяць 10 дзён. Не ўсе згодныя з вынікамі аналізаў, аспрэчваюць іх. Мы спрабавалі нават узяць асобнага лабаранта на працу з прыватным малаком, але не здолелі знайсці работніка. Справа тут не ў грошах, а ў пастаяннай напружанасці.

Каб палепшыць сітуацыю, у гаспадарцы пайшлі на закуп электронных прыбораў для вымярэння тлушчу. Для гэтага дастаткова толькі адной хвіліны. Але і тут ёсць свае хібы, таму спрэчкі не знікаюць.

Далейшае развіццё прыватнага статка, лічыць Ігар Мяцеліца, будзе залежыць ад цэнавай палітыкі. Вяскоўцы мараць, каб малако набывалі ў іх па больш высокай цане, чым цяпер. Жыхары набліжаных да гарадоў вёсак вязуць свой прадукт на рынкі, дзе малако каштуе ўдвая даражэй. Але глыбінка можа разлічваць толькі на дзяржаўныя закупкі.

Па-другое, развіццё падсобных гаспадарак залежыць і ад стаўлення мясцовай улады, кіраўніка сельскай гаспадаркі. Добраму працаўніку карову дадуць у растэрміноўку на паўгода. Гектар пашы на карову ў Бацвінаўскім сельсавеце — не праблема. Падкормка пашы робіцца штогод. Штотыдзень кіраўніцтва раёна пытае ў кіраўнікоў сельсаветаў пра стан спраў з закупкай малака і маладняку ў насельніцтва.

У Бацвінаўцы гавораць: хто на зямлі працуе, той і гаспадарку трымае. Адмаўляюцца толькі нямоглыя ды гультаі.

— Шмат сем'яў імкнуцца працаваць і жыць лепш, — запэўнівае старшыня сельскага Савета. — Раніцай на калгасную майстэрню завітаеш — трэць вадзіцеляў і механізатараў прыязджаюць на працу на сваіх аўтамабілях. У каго ён лепшы, у каго горшы, але аўтамабіль для вяскоўца — гэта ўжо сапраўды не раскоша. Людзі зарабляюць на іх грошы дзякуючы асноўнай працы і хатняй гаспадарцы.

**Ілона ІВАНОВА.**
*Крычаўскі раён.*


МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ. Газета для выбарщиков і дэпутатаў мясцовых саветаў

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

**Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.**
**Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.**

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, дэпутат Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў Мінскай вобласці

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 21 03;
**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.**

